Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

гаў, якія павінны дзяліцца скарбніцай сваіх ведаў з парафіянамі. Ён будуе падмурак сваёй філасофіі на асабістых духоўных дысцыплінах і заклікае да Рэфармацыі, якую ахарактарызоўвае як калектыўнае вяртанне да Бацькоў царквы і Пісання. Самае галоўнае тое, што ён уздымае чытанне Святога Пісання як жыццёва важнае дзеянне, бо праз яго чалавек набывае моц быць чалавекам і заахвочваецца да любові. Падобна Братам агульнага жыцця, ён пісаў, што Новы Запавет – гэта закон Хрыста, якому людзі закліканы падпарадкоўвацца, і што Хрыстос – гэта прыклад, які яны закліканы пераймаць, а значыць, да якога прагнуць наблізіцца і ўпадобіцца.

12 ліпеня 1536 года Дызідэрыус Эразм Ратэрдамскі памёр у Базелі, дзе быў пахаваны ў кафедральным саборы горада. Тут, побач з адным з самых старажытных еўрапейскіх універсітэтаў і бібліятэкай, ён знайшоў свой апошні прытулак. Але ягоныя ідэі і думкі праз стагоддзі, дзякуючы кнігадрукаванню і захаванню ў бібліятэчных установах, працягваюць сваё жыццё побач з намі.


1. *Latourette K.S.* History of Christianity. New York : Harper & Brothers, 1953. P. 661.
2. *Roterodamus E.* The Erasmus Reader. Toronto : University of Toronto Press, 1990. P. 138.
3. *Sinkević I.* Knights in Shining Armor: Myth and Reality 1450–1650. Chicago, 2006. P. 69.


*В.В. Урублеўскі*

## Метрычныя кнігі на захаванні ў апісанай частцы калекцыі № 23 Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (вопіс 1)

У артыкуле праводзіцца крыніцазнаўчая характарыстыка 14 метрычных кніг з апісанай часткі «Калекцыі матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры» (№ 23) Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Адзначаюцца перспектывы далейшага выяўлення метрычных кніг у матэрыялах калекцыі, індэксацыі найбольш



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

прадстаўнічых метрычных кніг з шырокімі лакацыяй і храналагічным ахопам, іх запатрабаванасць у правядзенні рэгіянальных, мікрагістарычных і генеалагічных даследаванняў.

*Ключавыя словы:* метрычныя кнігі, гісторыя Беларусі, канфесійнае справаводства, канфесійныя ўстановы, бібліятэкі, архівы.

*В.В. Врублевкий*

## Метрические книги, хранящиеся в описанной части коллекции № 23 Центральной научной библиотеки им. Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси (опись 1)

В статье дана источниковедческая характеристика 14 метрических книг из описанной части «Коллекции материалов по истории, науке, культуре» (№ 23) Центральной научной библиотеки имени Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси. Отмечены перспективы дальнейшего обнаружения метрических книг в материалах коллекции, индексация наиболее репрезентативных метрических книг с широкими локацией и хронологическим охватом, их востребованность в проведении региональных, микроисторических и генеалогических исследований.

*Ключавыя словы:* метрические книги, история Беларуси, конфессиональное делопроизводство, конфессиональные учреждения, библиотеки, архивы.

*V.V. Urubleuski*

## Metric books of the described part of the collection № 23 of the Yakub Kolas Central Scientific Library of the National Academy of Sciences of Belarus (Inventory 1)

The article describes the source study of 14 metric books from the described part of the «Collection of materials on history, science, culture» (№ 23) of the Yakub Kolas Central Scientific Library of the National Academy of Sciences of Belarus. Prospects for further



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

discovery of metric books in the materials of the collection, indexing of the most representative metric books with wide location and chronological coverage, their need for regional, microhistorical and genealogical research are noted.

*Keywords:* metric books, history of Belarus, confessional office work, confessional institutions, libraries, archives.

Матэрыялы сакраментальнага характару, сфарміраваныя ў працэсе канфесійнага справаводства, з’яўляюцца нетыповым прадметам захавання бібліятэкі ў традыцыйным разуменні гэтага паняцця. Гэта вынікае галоўным чынам з замацаванай практыкі арыентаванасці бібліятэк на захаванне кніжнай друкаванай літаратуры.

Аднак XXI ст. ўносіць у гэты працэс свае карэктывы, магчымыя з-за ранейшых абставін, абумоўленых падзеямі XX ст. Велізарныя комплексы дакументаў рукапіснай спадчыны, створаныя і накопленыя дзейнасцю несавецкіх дзяржаўных інстытуцый, непартыйных арганізацый, канфесійных устаноў і прыватных асоб, не мелі належнай увагі да сябе з боку партыйных органаў або проста станавіліся маўклівымі ахвярамі тэрміновых эвакуацый, ваенных дзеянняў ці безгаспадарлівасці на месцах.

У 1960–1980 гг. пачаўся працэс паступовага ўсведамлення каштоўнасці дакументальных матэрыялаў, якія зберагаліся ў няпрофільных месцах, у тым ліку на ўзроўні дзяржаўных бібліятэк. Асобныя помнікі ахвяроўваліся дзяржаўным бібліятэкам навукоўцамі, нешта выкупалася з прыватных калекцый. Такім чынам фарміраваліся падмуркі да стварэння профільных бібліятэчных падраздзяленняў. Менавіта такое падраздзяленне ўзнікла ў межах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей ЦНБ НАН Беларусі) ў 1963–1964 гг. і атрымала назву аддзела рэдкіх кніг. Паколькі акрамя рэдкіх кніг на захаванне паступалі таксама рукапісы, то назва аддзела набыла дапоўнены выгляд за кошт сектара рукапісаў, заснаванага ў 1979 г., – аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. Інтэнсіфікацыя працы



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

аддзела стала магчымай, дзякуючы яго кіраўніцы Л.І. Збралевіч [1].

Менавіта ў 1970–1980 гг. у аддзел рукапісаў пачалі паступаць набыткі палявых экспедыцый супрацоўнікаў Акадэміі навук у аддаленыя раёны рэспублікі, адкуль у ліку іншага прывозіліся матэрыялы канфесійнага справаводства.

На захаванні аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў у апісанай частцы «Калекцыі матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры» (№ 23) маецца 14 рукапісных метрычных кніг як матэрыялаў канфесійнага справаводства. Усе згаданыя адзінкі тэрытарыяльна адносяцца да колішняй Заходняй Беларусі, далучанай у 1939 г. да БССР. Трынаццаць адзінак з чатырнаццаці храналагічна належаць да дарэвалюцыйнага перыяду і ахопліваюць прамежак часу з 1748 па 1915 г. Усе кнігі адсканаваны ў лютым 2020 г. па замове загадчыцы аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГА Беларусі ў г. Мінску) М.Т. Скіданавай і паступілі ў калекцыю лічбавых копій НГА Беларусі № 18.

Метрычныя кнігі для рымска-каталіцкай канфесіі на тэрыторыі Беларусі пачалі весціся з першай паловы XVII ст. Менавіта пасля Віленскага сінода 1602 г., у канстытуцыях якога падкрэслівалася неабходнасць выканання дакументаў, прынятых Трыдэнцкім саборам 1563 г., і вызначыўся абавязак фіксацыі сакрамэнтаў хрышчэння і шлюбу. Неабходнасць вядзення і пастаяннага захавання кніг аб памерлых была адзначана ў «Рымскім рытуале» Папы Паўла V у 1614 г. Першыя дакладна вядомыя нам метрычныя кнігі каталіцкай канфесіі аб хросце і вянчанні датуюцца першай паловай XVII ст. [2], аб смерці – пачаткам XVIII ст. [3].

Вядзенне метрычных кніг аб хрышчэннях і шлюбах для вернікаў грэка-каталіцкай (уніяцкай) канфесіі прадпісвалася заканадаўчым актам, прынятым у 1667 г. на 17-й кангрэгацыі Базыльянскага ордэна ў Вільні. Аднак першыя вядомыя кнігі з фіксацыяй адпаведных царкоўных Таямніц адзначаюцца па тэрыторыі Беларусі ўжо ў дачыненні да першай паловы XVII ст. Сінодзікі-памянікі да 1730–1750 гг. замянялі метрычныя кнігі аб смерці, але пасля саступілі ім месца [4].



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Самай ранняй ініцыятывай праваслаўных іерархаў адносна пачаткаў вядзення метрычных кніг адзначыўся Метрапалітанскі сабор, скліканы ў 1646 г. кіеўскім мітрапалітам Пятром Магілай у Кіеве. Ужо на ім было пастаноўлена, каб кожны святар вёў метрычныя кнігі, аднак пашырэнне справы вядзення метрык адбылося ўжо пры Пятры I у межах царкоўнай рэформы 1718–1722 гг. [5].

Метрычная кніга займае вельмі важнае месца ў даследаванні такіх напрамкаў сучаснай гістарычнай навукі, як антрапаніміка, рэгіянальная, канфесійная і сацыяльная гісторыя, некрапалістыка, гісторыя канфесійнага справаводства. Можна вылучыць наступныя блокі інфармацыі, якія спрыяюць выпрацоўцы высноў у рэчышчы акрэсленых вышэй гістарычных напрамкаў: 1) асаблівасці напісання прозвішчаў, а таксама родавых і асабістых мянушак замест прозвішчаў; 2) асаблівасці напісання кананічных і народных форм хрысціянскіх імёнаў, папулярныя імёны, імёны па бацьку; 3) межы прыходу або парафіі, першая згадка асобнага населенага пункта ў дакументах, змена месца жыхарства; 4) змешаныя сем'і праваслаўных і іншаслаўных, міжэтнічныя шлюбы; 5) пазнакі аб сацыяльным і служылым стане; 6) асобы ўспрыемнікаў і сведкаў; 7) фіксацыя пазашлюбных дзяцей; 8) месцы пахавання, першыя згадкі вясковых некропаляў; 9) медыцынская тэрміналогія ў графе «прычыны смерці»; 10) прыпіскі на палях.

На захаванні аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі ў калекцыі 23 (вопіс 1) больш за ўсё адзінак належыць да канфесійнага справаводства Параф'янаўскай рымска-каталіцкай парафіі з цэнтрам у мястэчку Параф'янава Вілейскага павета Мінскай (пасля 1843 г. Віленскай) губерні – 6 штук [6]. Самая ранняя за 1800–1827 гг. складзена на латыні (1 шт.), метрыкі за 1835–1849 гг. – па-польску (3 шт.), за 1915 г. – па-руску (1 шт.), за 1916–1924 гг. – па-польску (1 шт.). У зместавым плане яны падзяляюцца на метрычныя кнігі аб хросце, шлюбе і смерці. У той час як большасць метрык уяўляюць сабой шнураваныя прыхадскія экзэмпляры, адзіная паслярэвалюцыйная метрыка комплексу, якая тычыцца прамежка часу ў 1916–1924 гг., відавочна ўяўляе сабой



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

нататкавы чарнавы экзэмпляр метрык аб шлюбе з імёнамі маладых, іх сацыяльным статусам і датамі трайнога перадшлюбнага агалошвання (дата шлюбу традыцыйна прыходзілася на трэцяе агалошванне).

На сённяшні момант аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі – трэцяе па значнасці сховішча метрычных кніг Параф'янаўскага касцёла пасля НГА Беларусі ў г. Мінску і Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна. Усяго комплекс на дадзены момант складаецца з адзінак захавання за 1784–1937 гг.

Тэрытарыяльна блізкімі да Параф'янава з'яўляюцца парафіі ва Удзеле Дзісенскага павета, Дунілавічах і Ажунах Вілейскага павета Мінскай (пасля 1843 г. Віленскай) губерні. У ЦНБ НАН Беларусі маецца па адной адзінцы захавання, прыналежных да справаводства Дунілавіцкай грэка-каталіцкай царквы за 1814–1822 гг. [7], Удзелаўскага за 1772–1800 гг. [8] і Ажунскага за 1799–1809 гг. [9] рымска-каталіцкіх касцёлаў. У адносінах да першай мовай справаводства ў крыніцы з'яўляецца польская, да другой і трэцяй – лацінская, што сведчыць пра розныя моўныя звычаі і ўстаноўкі ў вядзенні дакументаў сакраментальнага характару. У зместавым плане метрычная кніга Удзелаўскага касцёла змяшчае запісы аб смерці, астатніх – аб хросце.

Другой геаграфічнай лакацыяй, з якой паходзяць метрычныя кнігі апісанай часткі калекцыі № 23, з'яўляецца паўднёва-заходняя Беларусь. Яна прадстаўлена метрычнымі кнігамі Ружанскай грэка-каталіцкай царквы часоў Слонімскага павета Навагрудскага ваяводства за 1748–1761 гг. [10], Пінскага касцёла Пінскага павета Мінскай губерні за 1799–1829 гг. [11], Вольненскай грэка-каталіцкай царквы Навагрудскага павета Мінскай губерні за 1791–1809, 1821–1826 гг. (2 шт.) [12], Чэрскай праваслаўнай царквы часоў Берасцейскага павета Берасцейскага ваяводства за 1760–1777 гг. [13] Адпаведна мовамі складання згаданых метрычных кніг выступілі лацінская (Пінскі касцёл), польская (Ружанская і Вольненская цэрквы), руская з царкоўнаславянізмамі (Чэрская царква). У зместавым плане метрычныя кнігі Ружанскай царквы і Пінскага касцёла



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

змяшчаюць запісы аб хросце і шлюбе, Вольненскай і Чэрскай цэркваў – аб хросце.

На бягучы час калекцыя № 23 ЦНБ НАН Беларусі не апісаная цалкам, а значыць існуюць перспектывы да выяўлення новых метрычных кніг, якія могуць тэрытарыяльна і храналагічна запоўніць геаграфічныя і часавыя лакуны. Пакуль жа мы маем: 1) прадстаўленасць метрыкамі ў дачыненні да Паўночна-Заходняй (Віцебская вобласць) і Паўднёва-Заходняй (Брэсцкая вобласць) Беларусі; 2) наяўнасць рымска-каталіцкіх (9 шт.), грэка-каталіцкіх (уніяцкіх) (4 шт.) і праваслаўных метрычных кніг (1 шт.) – усяго 14 шт.; 3) прысутнасць метрычных кніг аб хросце, шлюбе і смерці; 4) храналагічную прадстаўленасць з сярэдзіны XVIII ст. па першую трэць XX ст.; 5) прыналежнасць метрычных кніг комплексу да прыхадскіх экзэмпляраў.

У цэлым дапушчальна меркаваць, што колькасць метрычных кніг на захаванні ЦНБ НАН Беларусі наўрад ці будзе большай за паўсотні экзэмпляраў, а таму вартым прадстаўляецца зрабіць індэксацыю на асобныя, найбольш прадстаўнічыя, метрычныя кнігі з шырокімі лакацыяй і храналагічным ахопам. Пад індэксацыяй разумеецца стварэнне баз дадзеных з пазначэннем біяметрычнай інфармацыі аб асобах з метрычных запісаў аб хрышчэнні, шлюбе і смерці для аблягчэння ў правядзенні рэгіянальных, мікрагістарычных і генеалагічных даследаванняў.

1. Путь длиною в полстолетия : к 50-летию образования отд. редких кн. и рукоп. Центр. науч. б-ки им. Я. Коласа Нац. акад. наук Беларуси : [сб. ст.] / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Я. Коласа ; сост.: А.В. Стефанович, М.М. Лис ; редкол.: А.И. Груша (гл. ред.) [и др]. Минск, 2015. С. 4–5, 241.

2. *Сыцько К.В.* Прычыны ўвядзення метрычных кніг у Рымска-каталіцкай царкве і ўкараненне метрыкацыі ў парафіях на тэрыторыі Беларусі // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. Мінск, 2020. Вып. 18. С. 174–182.

3. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (ЛДГА). Ф. 694. Воп. 5. Спр. 3753. Метрычная кніга аб памерлых Ражанкаўскага Пятра-Паўлаўскага касцёла Віленскага ваяводства за 1712–1719 гг.

4. *Лісейчыкаў Д.В.* «Азъ, Іерей…»: «руская» мова метрычных кніг уніяцкіх цэркваў Вялікага Княства Літоўскага XVII – XVIII стагоддзях // Київська Академія. 2016. Вип. 13. С. 109–172.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

5. *Антонов Д.Н. Антонова И.А.* Метрические книги России XVIII – начала XX в. М., 2006. 385 с.

6. Параф’янава – аграгарадок Параф’янаўскага с/с Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1056, 1058, 1060, 1062, 1101, 1102. Метрычныя кнігі Параф’янаўскага касцёла аб хросце за 1800–1827, 1840–1849 гг., шлюбе за 1835–1841 і смерці за 1838–1848, 1915 гг., рэестры венчаных за 1916–1924 гг.

7. Дунілавічы – аграгарадок Дунілавіцкага с/с Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1045. Метрычная кніга Дунілавіцкай грэка-каталіцкай царквы аб хросце за 1814–1822 гг.

8. Удзела – аграгарадок Удзелаўскага с/с Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 947. Метрычная кніга Удзелаўскага касцёла аб смерці за 1772–1800 гг.

9. Ажуны – вёска Варапаеўскага с/с Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. РБ ; ЦНБ імя Якуба Коласа. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1131. Метрычная кніга Ажунскага касцёла аб хросце за 1799–1809 гг.

10. Ружаны – гарадскі пасёлак Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1128. Метрычная кніга Ружанскай грэка-каталіцкай царквы аб хросце і шлюбе за 1748–1761 гг.

11. Пінск – горад, цэнтр Пінскага р-на Брэсцкай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1130. Метрычная кніга Пінскага касцёла аб хросце і шлюбе за 1799–1829 гг.

12. Вольна – вёска Вольненскага с/с Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1169–1170. Метрычныя кнігі Вольненскай грэка-каталіцкай царквы аб хросце за 1791–1809, 1821–1826 гг.

13. Чэрск – вёска Дамачаўскага с/с Брэсцкага р-на Брэсцкай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1185. Метрычная кніга Чэрскай праваслаўнай царквы аб хросце за 1760–1777 гг.

*К.В. Сыцько*

# Склад бібліятэкі Валкалацкай парафіі ў XVIII–XX стст. (паводле матэрыялаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі і парафіяльнага архіва)

У артыкуле апісаны лёс бібліятэкі парафіі Святога Яна Хрысціцеля ў Валкалаце. Рэканструіруецца яе склад, прыводзяцца звесткі аб папаўненні колькасці кніг у бібліятэцы ў XVIII–XX стст., яе статусе ў сістэме парафіі, а таксама захаванасці на сённяшні дзень.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by